

ЛУНІНЕЧЧЫНА Ў МАІМ ЛЁСЕ

# Сцежкамі маладосці

Можна ўжо лічыць традыцыяй ліпеньскае наведванне Лунінеччыны ўраджэнцамі нашых мясцін з Ізраіля. Трэці год запар прыязджаюць дэлегацыі на чале з выхадцам з Лахвы Копелем Калпаніцкім — чалавекам, які стаяў ля вытокаў знаёмства з землякамі за мяжой. Многія з яго родных, як і тысячы яўрэяў, загінулі ў гады фашысцкай акупацыі. Адпомсцячы ворагам у партызанскім атрадзе, пасля вайны ён пераехаў на гістарычную зямлю продкаў, але смутак па малой радзіме не даваў супакоіцца дасягнутым матэрыяльным дабрабытам. Як толькі стала магчымым, прыехаў у Лахву, устанавіў сувязі з мясцовым кіраўніцтвам. Ужо на наступны год арганізаваў дапамогу ў рэканструкцыі помніка на магіле ахвяр гета, потым па яго просьбе сельсавет паклапаціўся пра захоўванне старых яўрэйскіх могілак у вёсцы. А цяпер Копель Калпаніцкі выношвае ідэю стварэння музея яўрэйскай гісторыі Лунінеччыны — нельга дапусціць, каб за некалькі дзесяцігоддзяў былі згублены шматвяковыя набыткі старажытнага народа, прадстаўнікоў якога па волі лёсу цяпер вельмі мала сярод сучасных нашых жыхароў. Тым больш, што пра гэта нагадваюць магілы амаль дзесяці тысяч яўрэяў, пахаваных у брацкіх магілах Лунінца, Кажан - Гарадка, Лахвы, Луніна, Мікашэві-

чаў, Чуча[illegible]чаў.

Дарэчы, вялікі Пушкін заклікаў да „любви к родному пепелищу, любви к отческим гробам". На жаль, не можам канстатаваць наяўнасці такога высакароднага пачуцця ў пераважнай большасці суайчыннікаў. Але яму трэба вучыцца — у ізраільцян. Пра гэта ў прывітальным слове да гасцей пранікнёна сказаў старшыня калгаса „Перамога" Міхаіл Піліпавіч Шутаў. Прыемна адзначыць, што многія лунінчане разумеюць важнасць захоўвання мемарыяльных месцаў. Перш за ўсё неабходна прыгадаць дырэктара МП „Лунінецрамбуд" Васіля Мікалаевіча Вакульчыка і працаўнікоў яго калектыву. Наглядаюць за яўрэйскімі могілкамі ў Гарадоцкім, Лахвенскім, Лунінскім сельсаветах, якія таксама наведалі члены дэлегацыі Ізраіля.

Пасля вайны Копель Калпаніцкі змяніў дзень свайго нараджэння — цяпер у яго пашпарце адзначана 9 мая. Галоўным святам у сваім жыцці лічаць Дзень Перамогі і іншыя ўдзельнікі Вялікай Айчыннай — Шлома Альпінер і Зелік Пінхусовіч з Лунінца. Абрахам Фельдман з Кажан - Гарадка, Ісак Слуцкі з Лахвы.

...Людзі больш чым 70-гадовага ўзросту, якія наведалі малую радзіму амаль праз паўвека, цешыліся асалодай „дыма отечества". Трэба было бачыць іх слёзы на магілах, іх хваляванне каля месцаў, дзе знаходзіліся родныя дамы, іх радасць пры пазнаванні старых куточкаў неўявіма змяніўшагася горада. Яны не заўважалі нашых праблем, а, можа, тактоўна пра іх не згадвалі.

Але ў дэлегацыі былі і ўраджэнцы Давыд - Гарадка, суседняга, Столінскага раёна, для якіх Лунінец — не больш, чым звычайны турыстычны аб'ект. Дзякуй ім, што яны не заплюшчвалі вочы на нашы недахопы. Тыя ж самыя, якімі абураемся мы: адсутнасць гарачай вады, нізкі ўзровень гасцінічнага сервісу, раскапаныя цэнтральныя вуліцы, быццам пасля бамбёжак.

Моўчкі выслухоўвала справядлівыя заўвагі старых людзей. І сумна думала: можа, правільна рабіў сусветна вядомы мастак Марк Шагал, які пасля выезду ні разу не наведаў родны Віцебск, таму што хацеў захаваць яго ў душы чыстым і светлым уражаннем дзяцінства...

**Т. КАНАПАЦКАЯ.**



**НА ЗДЫМКАХ:** ля брацкай магілы ахвяр Кажан - Гарадоцкага гета выступіў Шлома Альпінер з Ізраіля і старшыня райсавета П. А. Скарабагацька; госці з Ізраіля ў дзень святкавання 49-й гадавіны вызвалення Лунінца.

Фота Т. СОЦ і М. ШАРЭЙКІ.